С. У. КСЯНЗОЎ

# ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУВЯЗІ БЕЛАРУСКАЙ ССР І ЕЎРАПЕЙСКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ КРАІН: ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ

У савецкай гістарычнай літаратуры няма адзінай думкі па пытанню перыядызацыі дружалюбных сувязей паміж СССР і сацыялістычнымі краінамі. Так, В. І. Зуеў і Ш. П. Санакоеў [1] вылучаюць тры этапы развіцця сусветнай сістэмы сацыялізму. Першы (1944—1955) характарызуецца юрыдычным афармленнем брацкіх зносін сацыялістычных краін цераз заключэнне двухбаковых дагавораў аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе. Другі этап пачынаецца з 14 мая 1955 года (заключэнне Варшаўскага дагавора) і працягваецца да канца 50-х гадоў. У рамках гэтага этапу ўвайшло ў сістэму шматбаковае супрацоўніцтва, былі створаны Палітычны кансультатыўны камітэт, Камітэт міністраў абароны, З'яднанае камандаванне ўзброеных сіл. Трэці этап (60-я—70-я гады) пашырыў палітычную кансалідацыю і супрацоўніцтва дзяржаў сацыялістычнага супольніцтва на аснове новых двухбаковых дагавораў.

Цераз развіццё міжпартыйных сувязей разглядае праблему перыядызацыі А. П. Тупікін [2]. З сярэдзіны 40-х да канца 50-х гадоў гэтыя сувязі развіваліся на ўзроўні Цэнтральных Камітэтаў камуністычных і рабочых партый. Ішоў цяжкі працэс перабудовы сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэм у краінах народнай дэмакратыі. Другі этап (60-я гады) аўтар характарызуе замацаваннем сувязей на мясцовым узроўні, паміж сталымі партнёрамі, пераводам іх на планавую аснову. Трэці этап А. П. Тупікін адносіць да 70-х — пачатку 80-х гадоў і лічыць яго зместам пачатак ажыццяўлення прамых зносін працоўных калектываў.

Нельга атоесамліваць этапы развіцця сусветнай сістэмы сацыялізму, этапы развіцця міжпартыйных зносін, камуністычных і рабочых партый сацыялістычных краін з перыядызацыяй інтэрнацыянальных сувязей Беларускай ССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін. Але, безумоўна, яны цесна звязаны.

Беларускія гісторыкі плённа працуюць над праблемай супрацоўніцтва Беларусі з сацыялістычнымі краінамі. У абагульненых працах «Гісторыя Беларускай ССР» (Мінск, 1971—1975), «История Белорусской ССР» (Минск, 1977), у кнігах С. Д. Вайтовіча, Н. С. Вараб'я, В. С. Талстога, Э. А. Лейкіна [3] і іншых разгледжаны шматгранныя аспекты інтэрнацыянальных сувязей рэспублікі.

Каштоўным укладам у даследаванне пытання з'явілася калектыўная манаграфія «Белорусская ССР и социалистические страны: укрепление дружбы, сотрудничества, братства 1945—1987 гг.» (Минск, 1987). У працы значнае месца займае абгрунтаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі Беларусі ў арганізацыі і пашырэнні інтэрнацыянальных сувязей працоўных рэспублікі і сацыялістычных краін. Раскрываецца пераход ад традыцыйных форм да плануемага супрацоўніцтва мясцовых, партыйных і дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый у сувязі з развіццём руху пароднёных гарадоў і раёнаў, перарастаннем кантактаў у рэгулярнае грамадска-палітычнае супрацоўніцтва.

Большая частка беларускіх даследчыкаў не вылучае ў гісторыі супрацоўніцтва Беларусі і сацыялістычных краін асобных этапаў, што, на наш погляд, недапушчальна. Таму мэта гэтага артыкула — вылучыць этапы супрацоўніцтва Беларускай Савецкай сацыялістычнай Рэспублікі і еўрапейскіх сацыялістычных краін. Аўтар разглядае гэта пытанне на аснове матэрыялаў Кампартыі Беларусі.

Кантакты камуністаў Беларусі і суседніх еўрапейскіх краін маюць даўнюю гісторыю. Цесным у 20—30-я гады было супрацоўніцтва з Камуністычнай партыяй Польшчы. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі з'яўлялася яе часткай. Беларускія і польскія камуністы разам змагаліся з буржуазнай дыктатурай Пілсудскага, разам пазналі горыч ліквідацыі партый у 1938 годзе.

З перамогай сацыялістычных рэвалюцый у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы к канцу 40-х гадоў сталі наладжвацца міжпартыйныя кантакты Кампартыі Беларусі. КПБ у канцы 40-х пачатку 50-х гадоў прымала ўдзел у міжпартыйных сувязях КПСС часцей за ўсё цераз партыйныя, дзяржаўныя, прафсаюзныя і іншыя дэлегацыі СССР, удзел у якіх прымалі і беларускія камуністы-кіраўнікі. Так, у 1948 годзе П. К. Панамарэнка

ўзначальваў дэлегацыю ЦК ВКП(б) на V з'ездзе Польскай Аб'яднанай рабочай партыі. Амаль да другой паловы 50-х гадоў Кампартыя Беларусі мела магчымасць ажыццяўляць толькі такога роду кантакты. Такім чынам, першы этап інтэрнацыянальных сувязей Беларускай ССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін можна аднесці да канца 40-х — сярэдзіны 50-х гадоў.

Чаму ў гэты перыяд шырокія масы працоўных не былі ўцягнуты ў інтэрнацыянальныя кантакты? З аднаго боку, існавалі аб'ектыўныя прычыны да пашырэння міжнародных зносін рэспублікі: беларускі народ унёс вялікі ўклад у разгром фашызма і Беларусь стала паўнапраўным членам ААН, на заходніх граніцах з'явіўся дружалюбны сусед — Польшча, цераз тэрыторыю якой мелася магчымасць развіваць зносіны з іншымі еўрапейскімі краінамі. Але, з другога боку, існавалі вялікія перашкоды на шляху інтэрнацыянальных кантактаў. Прадукцыйныя сілы Беларускай рэспублікі і большасці еўрапейскіх сацыялістычных краін, разбураныя вайной, не дазвалялі і марыць аб інтэграцыйных працэсах. Істотна перашкаджалі ўцягненню працоўных у інтэрнацыянальныя кантакты традыцыі аўтаркіі і адчужанасці, якія назапасіліся ў СССР к канцу 40 — пачатку 50-х гадоў. Гэта, безумоўна, адбілася і на міжнароднай дзейнасці БССР.

Такім чынам, аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны перашкаджалі ўцягванню шырокіх працоўных мас у інтэрнацыянальныя сувязі Беларускай ССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін у першае дзесяцігоддзе пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Кампартыя Беларусі павінна была зрабіць вялікія намаганні па пераадоленню бар'ераў і перашкод на шляху развіцця і замацавання дружалюбных зносін. Такая праца пачалася ў другой палове 50-х гадоў і працягвалася на працягу 60-х, 70-х і 80-х гадоў. Наступіў другі этап інтэрнацыянальных сувязей рэспублікі.

Кампартыя Беларусі і камуністычныя і рабочыя партыі еўрапейскіх сацыялістычных краін у 50—60-я гады імкнуліся павялічыць лік удзельнікаў інтэрнацыянальных сувязей. У 1956 годзе Брэсцкая і Гродзенская вобласці наладзілі дружалюбныя сувязі з прыгранічнымі Люблінскім і Беластоцкім ваяводствамі ПНР. Мінская вобласць і Варшаўскае ваяводства парадніліся ў 1959 годзе (з 1976 года Мінская вобласць супрацоўнічае з Плоцкім ваяводствам). У 1968 годзе Мінская вобласць наладзіла кантакты з акругай Патсдам (ГДР). Дружалюбныя сувязі Гомельскай і Паўднёва-Чэшскай абласцей, Магілёўскай вобласці і Габраўскай акругай НРБ пачаліся ў 1966 годзе. Віцебская вобласць у 1967 годзе парадніласся з Зялёнагурскім ваяводствам, а ў 1969 годзе з акругай Франкфурт-на-Одэры (ГДР). Сувязі пабрацімаў ахапілі ўсе сферы супрацоўніцтва.

У 70—80-я гады міжпартыйныя сувязі пачалі ажыццяўляцца на аснове двухгадовых планаў ЦК КПСС, ЦК КПБ, абласных камітэтаў КПБ і Цэнтральных Камітэтаў кампартый Балгарыі і Чэхаславакіі, Сацыялістычнай Адзінай партыі Германіі і Польскай Аб'яднанай рабочай партыі, акружкомаў, ваяводскіх камітэтаў, абкомаў партый. У планах вызначаліся асноўныя напрамкі і мерапрыемствы інтэрнацыянальнага супрацоўніцтва, дэталёва распісваліся ўзаемныя паездкі дэлегацый партыйных органаў, прадпрыемстваў і арганізацый. За гэты перыяд абкомы КПБ наладзілі сувязі з Бяла-падляскім, Улацлавацкім, Яленягурскім, Сувалкаўскім, Седльцкім і Таруньскім ваяводскімі камітэтамі ПАРП. У 80-х гадах 6 абкомаў КПБ супрацоўнічалі з 14 акружнымі, абласнымі і ваяводскімі партыйнымі камітэтамі БКП, САПГ, ПАРП, КПЧ. Наладзілі кантакты гарадскія і раённыя камітэты партый, партыйныя камітэты прамысловых прадпрыемстваў. Усталёўваліся прамыя сувязі працоўных калектываў.

Формы інтэрнацыянальных зносін уключалі абмен партыйнымі дэлегацыямі і групамі, лектарамі, сумесныя навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, Дні дружбы і культуры, узаемадзеянне працаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, абмен вопытам партыйнага кіраўніцтва эканомікай і іншыя.

Сённяшні дзень паказвае — большасць форм і метадаў дружалюбных зносін БССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін вычарпаны. «Мировой социализм переживает непростой, переломный период»[4]. У справе інтэрнацыяналізацыі ўжо недастаткова абмену дэлегацыямі, арганізацыі Дзён дружбы і культуры. Рашаючае значэнне ў прарыве да новага ўзроўню міжнародных сувязей будзе мець стварэнне інтэрнацыянальных структур, якія б усебакова ахаплівалі жыццё.

Дэлегат XIX партканферэнцыі Ю. А. Квіцынскі выказаў думку, што сацыялістычная інтэграцыя «всё ещё остаётся уделом аппарата» СЭВ и других административных органов, не стала делом, близким и простым людям в со-

цыялістычных краінах, всё ещё далека от их каждодневных интересов и вопросов. И здесь, как и в других областях, произошло отчуждение социалистического гражданина от социалистической политики. Нет инициативы и контроля масс, отсутствует обратная связь между механизмами управления и гражданами»[5]. Наспела неабходнасць стварэння аб'яднанага рынку сацыялістычных краін, які ўключаў бы ў сябе комплекс прынцыповых пытанняў пераўтварэння вытворчых адносін на інтэрнацыянальным узроўні. Гэта — ухіленне бар'ераў, якія перашкаджаюць свабоднаму перамяшчэнню тавараў і паслуг, спецыялістаў, грамадзян цераз граніцы краін-удзельнікаў супольніцтва. Гэта — стварэнне новага валютна-фінансавага механізма, паступовы рух да частковай, а потым і поўнай канверсаванасці нацыянальных валют і пераводнага рубля[6]. На XIX канферэнцыі КПСС прыцягнула ўвагу прапанова аб стварэнні парламента сацыялістычнага супольніцтва[7].

Зроблены канкрэтныя крокі па ўмацаванню і развіццю міжнародных зносін Беларусі. Вясной 1989 года прынята праграма супрацоўніцтва паміж ЦК Кампартыі Беларусі і ЦК Польскай аб'яднанай рабочай партыі. Гэта першы падобны дагавор аб прамых міжпартыйных сувязях КПБ і адной з камуністычных партый замежных краін. Праграма прадугледжвае сістэматычны абмен вопытам работы партыйных і дзяржаўных органаў, далейшае развіццё эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, актывізацыю прыгранічнага гандлю. Будуць пашырацца культурныя сувязі паміж творчымі саюзамі, моладдзю, сродкамі масавай інфармацыі. Будзе аказана падтрымка турысцкаму абмену і ўзаемным паездкам грамадзян па прыватных запрашэннях[8]. Намеціліся і новыя тэндэнцыі ў ідэалагічным супрацоўніцтве. Зыходзячы з Дэкларацыі КПСС і ПАРП аб савецка-польскім супрацоўніцтве ў галіне ідэалогіі, навукі і культуры, пачалося ліквідаванне «белых плям» у гісторыі двухбаковых зносін.

З другой паловы 70-х гадоў у сацыялістычных краінах выявіліся негатыўныя працэсы ў эканоміцы, сацыяльна-палітычнай і ідэалагічнай сферах. Камуністычныя і рабочыя партыі сацыялістычных краін шукаюць выйсце з цяжкага становішча. Трэба знайсці шляхі вырашэння супярэчнасцей, выхаду на новы ўзровень развіцця, у тым ліку абнаўлення форм і метадаў зносін паміж сацыялістычнымі краінамі. Па-рознаму вырашаюць наспеўшыя праблемы камуністычныя і рабочыя партыі еўрапейскіх сацыялістычных краін. Працягвае пошук у гэтым напрамку і Камуністычная партыя Беларусі. На XV Пленуме ЦК КПБ зроблена заява, што міжнародная дзейнасць рэспублікі была адметна абмежавана. Зараз, з набыццём рэальнага суверэнітэту, магчымасці па актывізацыі гэтай дзейнасці ў імя ўмацавання міру на планеце, па развіццю інтэграцыйных эканамічных працэсаў прыкметна пашырацца[9]. Відавочна, 90-я гады будуць пачаткам новага этапу інтэрнацыянальных сувязей Беларускай ССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін.

[1] Гл.: Зуев В. И. Мировая система социализма: экономические и политические аспекты единства (методологические проблемы). М., 1975; Санакоев Ш. П. Мировая система социализма: Основные проблемы и этапы развития. М., 1971.

[2] Гл.: Тупикин А. П. Творческое сотрудничество братских партий стран социализма. М., 1983.

[3] Войтович С. Д., Воробей Н. С., Толстой В. С. Сотрудничество Белорусской ССР с социалистическими странами. Минск, 1970; Лейкин Э. А. Дружба. Сотрудничество. Братство: Участие БССР во всестороннем развитии связей Советского Союза со странами социализма. Минск, 1983; Войтович С. Д. БССР в экономических отношениях СССР с зарубежными странами (1945—1987 гг.). Минск, 1989.

[4] XIX Всесоюзная конференция Коммунистической партии Советского Союза, 28 июня — 1 июля 1988 г. Стенографический отчет. М., 1988. Т. 1. С. 42.

[5] Там жа. Т. 2. С. 92.

[6] Луканов А. СЭВ перед новым этапом сотрудничества // Проблемы мира и социализма. 1989. № 1. С. 4.

[7] XIX Всесоюзная конференция КПСС. Т. 2. С. 92.

[8] Советская Белоруссия. 1989. 15 апреля.

[9] Там жа. 19 октября.